**УДК 398.332** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-79-3-70-76**

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ КАЛЯНДАРНЫЯ СВЯТЫ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ: СУЧАСНЫЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ І ФОРМЫ ВЫЯЎЛЕННЯ

***А.С. ЦЫГАНКОВА***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры***
***Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)***

*У артыкуле аналізуюцца сучасныя рэпрэзентацыі элементаў беларускай традыцыйнай культуры на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Раскрываюцца прагматычныя функцыі, якія выконваюць традыцыйныя каляндарныя святы беларусаў на сучасным этапе развіцця грамадства. Разглядаюцца формы і практыкі папулярызацыі каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння: ад фальклорных лекцый і майстар-класаў да маштабных этнафестываляў на аграсядзібах.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская традыцыйная культура, каляндарныя святы, рэпрэзентацыя, інструменталізацыя, этнарэгіянальны брэнд, Беларускае Падзвінне.*

**Уводзіны.** У сучасны перыяд да праблемы захавання культурнай разнастайнасці чалавецтва скіравана ўвага ўсёй сусветнай супольнасці, Беларусь не з’яўляецца выключэннем. Мэтанакіраваная рэпрэзентацыя і папулярызацыя элементаў беларускай традыцыйнай культуры (у прыватнасці, каляндарнай абраднасці) у апошнія гады стала характэрнай з’явай як вясковай, так і гарадской культурнай прасторы Беларусі. З аднаго боку, гэта абумоўлена прагматычнымі задачамі: развіццём турызму (прыцягненнем гасцей і кліентаў), камерцыйнымі выгодамі (пашырэннем сельскага прадпрымальніцтва, пошукам інвестараў, раскруткай мясцовых брэндаў), палітычнымі мэтамі (ідэалагічнае, патрыятычнае выхаванне і г.д.). З другога боку, працэс пошуку і стварэння нацыянальных і лакальных вобразаў на падставе традыцыйнай культурай спадчыны спрыяе кансалідацыі людзей як на нацыянальным, так і на лакальным узроўнях, задавальняе іх культурныя патрэбы, выконвае важныя пазнавальна-адукацыйныя і выхаваўчыя функцыі.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца ўстойлівы рост цікавасці да беларускай традыцыйнай культуры, што выяўляецца не толькі ў сферы акадэмічных даследаванняў, але і ў шырокай грамадскай зацікаўленасці традыцыйнымі рамёствамі, фальклорам, народным касцюмам, этнічнай кухняй, каляндарнымі святамі, сямейнай абраднасцю і г.д. Набыццё Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці надало магутны імпульс для з’яўлення якасна новых даследаванняў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў (у тым ліку яе сімвалічных аспектаў), якія адсутнічалі ў савецкія часы, калі прэрагатыва надавалася разгляду пераважна народнага побыту і матэрыяльнай культуры. Найперш звяртае на сябе ўвагу наяўнасць значнай колькасці даследаванняў традыцыйнай культуры і трансфармацый яе асобных элементаў у межах вясковага соцыума ў канцы XX – першай чвэрці XXI ст. Аднак спецыялістамі амаль не закраналіся (або разглядаліся фрагментарна) пытанні, звязаныя з рэпрэзентацыяй і папулярызацыяй беларускіх народных каляндарных свят у сучасным горадзе, не вывучаліся актуальныя практыкі захавання разнастайных форм і з’яў традыцыйнай культуры, не разглядаліся прагматычныя функцыі, што выконваюць традыцыйныя святы ў мадэрнізаваным грамадстве, а таксама не апісвалася іх роля ў стварэнні пазнавальнага іміджу асобных рэгіёнаў Беларусі. Важна адзначыць, што ў дадзеным артыкуле зроблены акцэнт не на традыцыйнай каляндарнай абраднасці як аб’ектыўнай дадзенасці, а на спробах і механізмах яе сучаснага выкарыстання, пераасэнсавання і пераўвасаблення, што падпадаюць пад канцэпцыю “вынаходніцтва традыцый” Э. Хабсбаўма [12, с. 1].

Наяўнасць асобных фактаў традыцыйнай культуры ў сучасным жыцці не столькі вяскоўцаў, колькі гараджан даволі цяжка ўкласці ў стройную сістэму вызначэнняў і класіфікацый [3, с. 61]. З аднаго боку, некаторыя з’явы традыцыйнай культуры па-ранейшаму працягваюць існаваць у “жывым бытаванні”. З другога боку, назіраецца свядомае імкненне асобных жыхароў з розных крыніц аднаўляць, паўтараць, пераймаць найбольш яскравыя і адметныя элементы беларускай традыцыйнай культуры, што фактычна з навуковага пункту гледжання этнографаў і фалькларыстаў адышлі ў нябыццё.

Мэта артыкула – на прыкладзе традыцыйных каляндарных свят Беларускага Падзвіння разгледзець працэс інструменталізацыі і папулярызацыі элементаў традыцыйнай культуры ў сучасным свеце, а таксама паказаць, чаму менавіта тая ці іншая культурная з’ява аказваецца вызначальнай для паказу адметнасці пэўнай тэрыторыі. Такім чынам у фокус даследавання трапляюць, найперш, сучасныя формы рэпрэзентацыі і практыкі папулярызацыі традыцыйнай каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння[1] – ад фальклорных лекцый і майстар-класаў да маштабных этнафестываляў на аграсядзібах, і тое, як кожная з іх можа ўздзейнічаць на аўдыторыю.

Крыніцазнаўчай базай для такога даследавання з’яўляюцца матэрыялы фальклорна-этнаграфічных экспедыцый, перыядычнага друку, а таксама сцэнары сучасных тэатралізаваных пастановак традыцыйных каляндарных свят, якія ўкараняюцца ва ўстановах культуры Віцебскай вобласці. Важнай крыніцай з’яўляюцца ўласныя палявыя запісы і назіранні, зробленыя аўтарам на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў 2019–2025 гг.

---

[1] У артыкуле разглядаюцца перадусім традыцыйныя каляндарныя святы беларусаў Падзвіння. Пры гэтым у прадметнае поле даследавання не трапляюць прафесійныя і дзяржаўныя святы (за выключэннем свят, якія ўваходзяць у структуру беларускага традыцыйнага календара), якія ў беларускай этналогіі прынята разглядаць асобна [1, с. 527, 542, 602].

Тэарэтычнай базай даследавання паслужылі ідэі Э. Хабсбаўма, згодна якому вынайдзеныя традыцыі разумеюцца як “набор практык рытуальнай або сімвалічнай прыроды, якія ставяць сваёй мэтай укараненне пэўных каштоўнасцяў і нормаў паводзін пры дапамозе паўтарэння, што натуральна мяркуе сувязь з падыходзячым гістарычным перыядам” [12, с. 48]. Вывучэнне асобных аспектаў функцыянавання традыцыйнай каляндарнай абраднасці Беларускага Падзвіння ў канцы XX – першай чвэрці XXI ст. адлюстравана ў шэрагу публікацый. Так, Т.І. Кухаронак і Т.В. Валодзіна прааналізавалі сучасныя практыкі надання каляндарным святам, звычаям і абрадам статусу гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, асаблівасці іх функцыянавання на сучасным этапе, перспектывы захавання, віды і спосабы рэпрэзентацыі [4]. У духу канструктывісцкага падыходу да вывучэння этнічнай ідэнтычнасці працэс “вынаходніцтва” і (рэ)канструявання нацыянальных традыцый і міфалагічных вобразаў вывучалі К.М. Каралёў [6], Т.В. Валодзіна [3], Н.А. Савіна [9] і інш.

**Асноўная частка.** Традыцыйная культура (у тым ліку каляндарная абраднасць), як важная частка культурнай спадчыны, мае магутны рэсурсны патэнцыял для ўстойлівага развіцця асобных рэгіёнаў і цэлых краін. У прыватнасці, яна можа выкарыстоўвацца для стварэння пазітыўнага іміджу тэрыторыі, для распрацоўкі лакальных, шырэй нацыянальных сімвалаў і брэндаў, для вылучэння канкурэнтных пераваг тэрыторыі.

На сённяшні дзень у працэсе рэпрэзентацыі і папулярызацыі форм традыцыйнай культуры ў рэгіёнах Беларусі ўмоўна можна вылучыць два асноўныя напрамкі: з аднаго боку, гэта працэс стварэння “твару” тэрыторыі “зверху”, гэта значыць актарамі, якія ўдзельнічаюць у ажыццяўленні культурнай палітыкі (рэспубліканская, абласныя, раённыя і г.д. адміністрацыі, дамы культуры, дамы фальклору і г.д.); з другога, – працэс стварэння іміджу тэрыторыі “знізу” (дзе задзейнічаны мясцовыя жыхары, сельскія прадпрымальнікі, фальклорныя калектывы і г.д.). Найбольшую актыўнасць у захаванні і адраджэнні каляндарнай абраднасці Віцебшчыны праяўляюць установы культуры і адукацыі, у прыватнасці, установы клубнага тыпу (гарадскія і сельскія дамы культуры, цэнтры рамёстваў, дамы фальклору і г.д.), у меншай ступені ўстановы адукацыі (школы, дзіцячыя садкі).

Агляд даступнага ў інтэрнэт-прасторы матэрыялу (сацыяльныя сеткі ўстаноў культуры, афіцыйныя сайты аддзелаў культуры раёнаў і г.д.), вынікі этнаграфічных даследаванняў аўтара, а таксама аналіз афіцыйных дакументаў і пастаноў аб культуры, паказваюць, што асноўны вектар дзейнасці ў галіне адраджэння і папулярызацыі традыцыйнай культуры ва ўстановах культуры і адукацыі базуецца на трох асноўных напрамках – інфармацыйным, адукацыйным і забаўляльным.

Звяртае на сябе ўвагу найперш інфармацыйны і адукацыйны напрамкі дзейнасці. Пасродкам правядзення сустрэч, майстар-класаў, “школ фальклору” і г.д. арганізатары мерапрыемстваў фарміруюць уяўленне сучаснага чалавека (пераважна мясцовых жыхароў) пра беларускую традыцыйную культуру, задавальняюць асветныя, эстэтычныя і пазнавальныя патрэбы насельніцтва. Так, у Браслаўскім раённым цэнтры культуры такія каляндарныя святы, як Радаўніца, Грамніцы, Ілля, Яблычны Спас і г.д., выносяцца на так званы “фальклорны час”, калі пераважна для дзяцей распавядаюць пра асаблівасці беларускай традыцыйнай культуры[2]. Ва Ушацкім раённым цэнтры культуры па ініцыятыве кіраўніцы ўзорнага фальклорнага калектыву “Спадчына” Г. Рудзёнак была створана “Школа фальклору”. За 2024 г. у ёй для дзяцей з Ушацкай сярэдняй школы правялі заняткі, прысвечаныя беларускім традыцыйным святам (Саракі, Вялікдзень), акрамя таго ладзіліся заняткі па народным гульням і танцам[3]. У Мікалаеўскім сельскім клубе (Мёрскі раён) на тэмы традыцыйнай культуры і фальклору рэгулярна праводзяцца “інфармацыйныя гадзіны” (напрыклад, на 2025 г. для дзяцей і дарослых было запланавана правесці мерапрыемства “Дзяды”, прысвечанае дню памяці продкаў[4]).

Шэраг устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны практыкуюць тэматычныя сустрэчы і пазнавальныя праграмы, прысвечаныя таму ці іншаму каляндарнаму святу. Так, у Бігосаўскім сельскім доме культуры (Верхнядзвінскі раён) праводзілі абрадавае мерапрыемства “Юр’е на двары – кароўку ў поле гані”[5]. У Дзісенскім гарадскім доме культуры праводзяцца тэматычныя вечары, якія, у тым ліку, прысвечаны беларускай святочнай культуры (напрыклад, “Яблочный спас – яблоко припас”[6]). Акрамя таго, ва ўстановах культуры і адукацыі Віцебшчыны рэгулярна арганізоўваюць выставы, прымеркаваныя да таго ці іншага каляндарнага свята, праводзяцца лекцыі, распрацоўваюцца праекты (напрыклад, філіял Глыбоцкага цэнтра культуры Запрудскі дом фальклору распрацаваў праект “Фальклорная скарбонка”, задачамі якога з’яўляецца “фарміраванне погляду на нацыянальную беларускую культуру, выхаванне грамадзяніна і патрыёта, засваенне фальклорнай спадчыны беларускага народа”)[7].

Інфармацыйны і адукацыйны напрамкі дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі часта раскрываюць сутнасць такіх каляндарных свят, якія звязаны з пахавальна-памінальнай абраднасцю (Троіца, Радаўніца, Дзяды), або свят, якія маюць пераважна рэлігійныя канатацыі (Вялікдзень, Спасы, Вадохрышча і г.д.).

Яшчэ адным значным напрамкам дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі з’яўляецца атракцыйны (забаўляльны), які ў першую чаргу скіраваны на задавальненне культурных патрэб насельніцтва, развіццё і рэалізацыю творчых здольнасцей наведвальнікаў, а таксама падтрыманне міжасабовай камунікацыі[8].

---

[2] Зап. А. Цыганковай у 2025 г. ад загадчыцы метадычнага аддзела Браслаўскага ЦКіНТ М.У. Сініцы, 1983 г. н., у г. Браслаў.
[3] Зап. А. Цыганковай у 2024 г. ад кіраўніцы ўзорнага фальклорнага калектыву “Спадчына” Г.С. Рудзёнак, 1965 г. н., у г. Ушачы.
[4] План работы філіяла “Мікалаёўскі СК” ДУК “Мёрскі ЦКіНТ” на 2025 год, прадстаўлены А.С. Шангінай у 2025 г.
[5] Рэферат на тэму “Праздник “Купалье” и его особенности на современных площадках”, прадстаўлены загадчыцай М. Кіч у 2025 г.
[6] План працы філіяла “Дзісенскі ГДК” ДУК “Мёрскі ЦКіНТ” на 2025 год, прадстаўлены А.С. Шангінай у 2025 г.
[7] Заяц А. Семінар. Нам засталася спадчына // Веснік Глыбоччыны. – 2023. – 15 сакавіка. – С. 5.
[8] Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: 20 ліпеня 2016 г. № 413-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г.: адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрв. 2016 г. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413 (дата звароту: 25.11.2025).

Характэрнай з’явай для ўсіх устаноў культуры Віцебскай вобласці з’яўляецца акцэнт на правядзенні такіх свят беларускага народнага календара, як Каляды, Масленіца, Купалле, што традыцыйна бытавалі ў гэтым рэгіёне.

Разглядаючы спецыфіку правядзення Каляд ва ўстановах культуры і адукацыі, бачна, што з усяго каляднага цыкла менавіта абрад калядавання прадстаўлены найбольш шырока. Калядныя абыходы дамоў, якія арганізоўваюць установы культуры, як правіла, уключаюць вялікую разнастайнасць традыцыйных элементаў. Так, у аграгарадках і вёсках Полацкага раёна (аг. Кушлікі[9], в. Багатырская[10], аг. Гомель[11] і г.д.) распрацаваны сцэнары калядных абыходаў з вялікай колькасцю аўтэнтычнага песеннага рэпертуару, наяўнасцю калядных персанажаў, якія дэталёва апісаны ў этнаграфічнай літаратуры (“каза”, “дзед”, “мядзведзь”, “цыганка” і г.д.). Працу па “захаванні першасных калядных традыцый Полацкай зямлі” ажыццяўляюць Полацкі райвыканкам і Полацкі раённы цэнтр культуры. Па іх ініцыятыве ў 2024 г. у рамках імпрэзы “Калядны разгуляй”, што праводзіцца з 2016 г., зладзілі конкурс у намінацыі “Лепшы калядны гурт”[12].

Такія народна-рэлігійныя святы каляднага цыкла, як Раство і Вадохрышча, перыядычна арганізуюцца ва ўстановах культуры і адукацыі Віцебшчыны, але яны пераважна звязаны з тэматычнымі сустрэчамі са святарамі[13], канцэртамі ці дапамогай царкве ў арганізацыі адпаведных мерапрыемстваў (напрыклад, Вадохрышча ў г. Мёры[14]). У сваю чаргу святкаванне Новага года, якое захавала рысы савецкай эпохі, цалкам пераўтворана ў танцавальна-забаўляльную імпрэзу.

Нельга абысці бокам святкаванні Масленіцы, якія арганізуюць установы культуры Віцебшчыны, бо гэтае народнае свята з’яўляецца яскравым прыкладам сучаснага “ф’южна” розных культур, мастацкай самадзейнасці і стэрэатыпных уяўленняў. Чырвонай стужкай усіх сцэнарыяў, выяўленых намі ў Полацкім, Верхнядзвінскім, Шумілінскім, Мёрскім, Браслаўскім і інш. раёнах, праходзіць ідэя карнавалізацыі (крыклівыя касцюмы, разнастайныя персанажы кшталту “пан блін”, “бацюшка-самавар”) і спаборніцтваў (выпякання бліноў на вуліцы, эстафеты і г.д.). Аднак сустракаюцца сцэнары і з традыцыйнымі элементамі святкавання, напрыклад, у Шумілінскім раёне ў некаторых дамах культуры вешаюць калодкі на нежанатых хлопцаў[15]. У традыцыйнай беларускай культуры “калодка” (часцей за ўсё абрубак дрэва, бервяно, палена, дровы і г.д.) сімвалізавала рытуальнае асуджэнне моладзі шлюбнага ўзросту, што не стварыла сям’ю на працягу года, выконвала функцыі матрыманіяльнай магіі і стымулявала плоднасць [8, с. 318]. У большасці фіксацый дзеянні з калодкай прымеркаваны да ўсяго Масленічнага тыдня [8, с. 321].

На сённяшні дзень адным з самых распаўсюджаных традыцыйных каляндарных свят, якое адзначаецца на тэрыторыі амаль усіх раёнаў Віцебскай вобласці, з’яўляецца Купалле. Розныя элементы традыцыйных купальскіх святкаванняў рэпрэзентуюцца ва ўстановах культуры Віцебшчыны. Праўда, ступень выкарыстання традыцыйных элементаў вагаецца ад мінімальнага прыстасавання аўтэнтычных элементаў купальскай абраднасці да сцэны і да іх кардынальнай трансфармацыі і пераасэнсавання. Таму на выхадзе часта атрымліваецца сцэнар свята, у якім цалкам традыцыйнае дзеянне, як збор купальскіх траў і зёлак, пляценне вянкоў і варажба, можа спалучацца з конкурсамі, дзе трэба трапіць сплеценым вянком у пэўную цэль[16]. Акрамя таго, ніводнае сучаснае святкаванне Купалля ва ўстановах культуры не можа абысціся без “ажылага” на сцэне персанажа народнай дэманалогіі (ведзьмы, чорта, русалкі і г.д.) ці папулярнага персанажа народных казак (Бабы Ягі, Кашчэя Бессмяротнага, багатыроў і г.д.), якія з’яўляюцца антаганістамі галоўнаму герою (вядучаму, станоўчаму персанажу). Атрымліваецца, што такія традыцыйныя элементы, як збор купальскіх зёлак, варажба, скокі праз вогнішча, купальскія песні, павер’е пра “ігру сонца” ўлічаны ў вялікай колькасці сцэнароў, але, як правіла, аказваюцца ўплеценымі ў сучаснае тэатралізаванае прадстаўленне.

Акрамя таго, ёсць шэраг свят і прымеркаваных да іх абрадаў, якія рэгулярна праводзяцца ва ўстановах культуры асобных раёнаў Віцебскай вобласці. Так, напрыклад, калядна-абрадавая гульня “Жаніцьба Цярэшкі” найбольш яскрава прадстаўлена ва ўстановах культуры і адукацыі Лепельскага, Полацкага, Докшыцкага, Глыбоцкага, Ушацкага раёнаў, што амаль цалкам супадае з арэалам дадзенага абраду ў мінулым [7, с. 7].

Элементы і атрыбуты велікоднай традыцыі ва ўстановах культуры Віцебшчыны таксама знайшлі ўвасабленне ў розных формах і варыянтах: праводзяцца заняткі для школьнікаў з дэманстрацыяй валачобнага абраду, майстар-класы па вырабе кулічоў і фарбаванню яек, арганізоўваюцца розныя канцэрты, прымеркаваныя да велікоднага перыяду[17]. Вялікдзень (у тым ліку валачобны абрад) дагэтуль працягвае функцыянаваць у “жывым” бытаванні (напрыклад, абход валачобнікаў па вёсцы практыкуецца на тэрыторыі Ушацкага, Браслаўскага,

---

[9] Сцэнар тэатралізаванага абраду “Каляды”, прадстаўлены загадчыцай Кушлікоўскага СДК Т. П. Семяньковай у 2020 г.

[10] Зап. А. Цыганковай у 2024 г. ад кіраўніцы народнага ансамбля “Галасы спадчыны” Т.С. Стараннік, 1960 г. н., у в. Багатырская Полацкага раёна.

[11] Зап. А. Цыганковай у 2024 г. ад дырэктара Гомельскага СДК І.В. Грышчанка, 1964 г. н., у аг. Гомель Полацкага р-на.

[12] Арт-уікэнд “Калядны разгуляй” правялі ў Полацкім раёне. – URL: https://vitvesti.by/index.php/kultura/art-u-kend-kaliadny-razguliai-pravial-polatck-m-raene.html (дата звароту: 14.12.2025).

[13] Зап. А. Цыганковай у 2025 г. ад загадчыцы метадычнага аддзела “Браслаўскага ЦКіНТ” М.У. Сініца, 1983 г. н., г. Браслаў.

[14] Зап. А. Цыганковай у 2025 г. ад рэжысёра народнага тэатра Мёрскага ЦКіНТ С. Рачыцкай, 1990 г. н., у г. Мёры.

[15] Зап. А. Цыганковай у 2025 г. ад метадыста ДУК “Шумілінскага ЦКіНТ” Л.А. Дарзнек, 1966 г. н., у г. Шуміліна.

[16] Сцэнар народнага свята “Купало”, прадстаўлены Фарынаўскім ЦК Полацкага раёна ў 2020 г.

[17] Зап. А. Цыганковай у 2025 г. ад загадчыцы метадычнага аддзела Браслаўскага ЦКіНТ М.У. Сініцы, 1983 г. н., у г. Браслаў.

Глыбоцкага, Полацкага, Докшыцкага, Бешанковіцкага, Лепельскага, Мёрскага, Шумілінскага раёнаў Віцебскай вобласці). Радзей ва ўстановах культуры і адукацыі Віцебшчыны адзначаюцца такія святы, як Багач, Пакровы, Узвіжанне, Благавешчанне, Гуканне вясны.

У выніку размоў з метадыстамі, арганізатарамі, загадчыкамі аддзелаў культуры і народнай творчасці, кіраўнікамі фальклорных калектываў і г.д., якія складаюць планы мерапрыемстваў на год, сцэнары таго ці іншага каляндарнага свята, стала зразумела, што асноўным фактарам, ад якога залежыць выбар каляндарнага свята (якое будзе ўключана ў план) і складанне яго сцэнара, з'яўляецца суб'ектыўнае бачанне саміх супрацоўнікаў культуры.

Варта адзначыць, што ў многіх месцах Беларускага Падзвіння пачынаюць "адраджаюць" каляндарныя святы (напрыклад, Гуканне вясны, Багач і г.д.), якіх гістарычна ў гэтым рэгіёне не існавала. Распаўсюджванню таго або іншага нехарактэрнага для пэўнай мясцовасці традыцыйнага каляндарнага свята таксама можа спрыяць наданне яму афіцыйнага дзяржаўнага статусу (напрыклад, з гэтым звязана шырокае распаўсюджанне ў рэгіёне радаўнічных памінанняў) [1, с. 4]. Апрача таго, развіццё сучасных мас-медыя зрабілі інфармацыю пра традыцыйныя святы больш даступнай для шырокай аўдыторыі, людзі могуць даведвацца пра святы, якія не з'яўляюцца часткай іх рэгіянальнай культуры, і пераняць іх у свае супольнасці. Так, у Зазерскім сельскім доме культуры (Полацкі раён) праводзіцца абрад "Пахаванне нясякомага", які амаль цалкам скапіяваны (з перакладам на беларускую мову) з відэароліка фальклорнага цэнтра "Песноходки" (г. Барнаўл Алтайскага краю)[18]. Часцей за ўсё такія святы з'яўляюцца прыкладамі выключна пастановачных мерапрыемстваў ва ўстановах культуры, калі прэрагатыва надаецца гатовым сцэнарам з Інтэрнэта, цалкам ігнаруючы арэал таго або іншага каляндарнага свята і гістарычныя лакальныя адметнасці рэгіёна.

Такім чынам, з аднаго боку, можна крытычна ацаніць дзейнасць устаноў культуры і адукацыі па адраджэнні традыцыйнай каляндарнай абраднасці беларусаў, бо дэкларуючы станоўчае памкненне "захавання спадчыны і перадачы яе дзецям" на справе рэпрэзентуюцца выключна спецыяльна адабраныя, адшліфаваныя, перапрацаваныя (праз прызму прафесійнай адукацыі, клішэ масавай культуры, мастацкай самадзейнасці і г.д.) асобныя элементы традыцыйнай культуры, што ў масавай свядомасці ўспрымаюцца як "сапраўдныя", "аўтэнтычныя". Аднак, з другога боку, трэба адзначыць і станоўчыя моманты такой дзейнасці (напрыклад, ухвальяльныя ініцыятывы і заахвочванне збіраць мясцовы фальклор, ствараць фальклорныя калектывы, займацца вывучэннем традыцыйных беларускіх песень і побытавых танцаў).

У апошнія дзесяцігоддзі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння асабліва заўважнымі сталі намаганні асобных аматараў народнай творчасці, фальклорных калектываў, сельскіх прадпрымальнікаў, краязнаўцаў па рэпрэзентацыі і папулярызацыі беларускіх традыцыйных каляндарных свят.

Значны ўклад у захаванне і папулярызацыю з'яў традыцыйнай культуры ўносяць фальклорныя калектывы. Дзякуючы дзейнасці такіх калектываў, як фальклорны гурт "Варган", гурт архаічных спеваў "Княжыч", народны фальклорны ансамбль "Галасы спадчыны" і інш., на тэрыторыі Беларускага Падзвіння актыўна рэпрэзентуюцца элементы каляднай абраднасці (найперш, абрад калядаванне, калядна-абрадавая гульня "Жаніцьба Цярэшкі"), такія святы, як Масленіца, Вялікдзень (у прыватнасці, валачобны абрад), Купалле, Жніво. Рэпрэзентацыю каляндарнай абраднасці беларусаў, якой займаюцца калектывы, умоўна можна падзяліць на "прамы" і "ўскосны" паказы народнай традыцыі.

Пад "прамым" паказам мы разумеем спробу дакладнага капіявання аўтэнтычнай традыцыі, пераймание першародных форм традыцыйнай культуры, народнай песні, танца ці звычаю [13, с. 152]. Па-першае, фальклорныя калектывы шмат робяць для стымулявання і захавання спантанных праяў традыцыйнай каляндарнай абраднасці ў натуральных умовах яе бытавання. У якасці прыкладу можна прывесці калядныя абходы ўдзельнікаў гуртоў па хатах у вёсках Докшыцкага і Полацкага раёнаў, правядзенне гуртом "Варган" валачобнага абраду ў в. Параф'янава Докшыцкага раёна, святкаванне Купалля гуртом "Княжыч" у Расонскім раёне і г.д. Па-другое, гуртамі ажыццяўляецца "адаптацыя" асобных элементаў традыцыйнай культуры да публічнай сцэны ў музеях, ва ўніверсітэтах, на фестывалях і г.д. Падчас мерапрыемстваў выкарыстоўваюцца і нават інсцэнуюцца цэласныя творы, фрагменты або асобныя ўзоры вусна-фальклорнай традыцыі, яны пераносяцца і перафарматоўваюцца ў іншую стылістычную сістэму [13, с. 69].

Ідучы за логікай Т.В. Валодзінай, можна вылучыць характэрныя змены, якія адбываюцца з элементамі традыцыйнай культуры падчас яе перафарматавання ў іншую сістэму. Па-першае, пераносіцца рытуальная прастора святкавання з прыроднай сферы ў сацыяльную (гарадскі парк, канцэртная заля і г.д.). Па-другое, у большасці выпадкаў адбываецца падзел удзельнікаў на "выканаўцаў" і "гледачоў", чаго не было ў традыцыйнай культуры. Па-трэцяе, існуе пэўная культура сцэны з распрацаванай мовай жэстаў, правіламі паводзін і ўзаемадзеяннем з гледачамі, гэта значыць у цэлым адаптаваныя элементы традыцыйнай культуры выглядаюць адрэпетавана і ярка, бо гэтага часта патрабуе сцэна.

У адрозненні ад "прамой" рэпрэзентацыі абрадава-святочнай дзеі, "ускосная" мае іншыя характарыстыкі, выкарыстоўвае іншую сістэму камунікацыі: тэатр, музыку, радыё, відэа, выяўленчае мастацтва і г.д. [13, с. 152]. Такім чынам, адбываецца не столькі імітацыя асобнай з'явы сапраўднай, арыгінальнай традыцыйнай культуры, колькі яе інтэрпрэтацыя і пераасэнсаванне ў іншых формах камунікацыі, спроба адкрыта інтэграваць яе ў сучасную

[18] Зап. А. Цыганковай у 2024 г. ад культарганізатара Зазерскага СДК М.В. Белавус, 1984 г. н., у в. Зазер'е Полацкага р-на.

культурную сістэму [13, с. 152]. Так, у 2025 г. гурт “Варган” правёў тэатралізаваную пастаноўку “Калядная містэрыя”, на якой элементы традыцыйнай культуры спалучаліся з сучаснымі тэхналогіямі, тэатральнымі формамі і гукавымі эфектамі[19]. Акрамя таго, музыкі з фальклорнага гурта займаюцца апрацоўкай беларускіх традыцыйных песень, ствараючы глыбокія інструментальныя кампазіцыі.

Акрамя фальклорных калектываў і аб’яднанняў, немалы ўнёсак у справу папулярызацыі каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння робяць сельскія прадпрымальнікі. Аналіз іх дзейнасці ўздымае шэраг цікавых аспектаў. Па-першае, каляндарныя святы актыўна выкарыстоўваюцца для брэндынгу асобных турыстычных дэстынацый і лакацый. Па-другое, атрыбуты каляндарных святкаванняў, розныя элементы святочнай культуры ўжываюцца для стварэння іміджу таго ці іншага прадукту, паслугі і/або месца. Так, досыць распаўсюджанай з’явай на тэрыторыі Беларускага Падзвіння з’яўляецца правядзенне каляндарных святаў у аграсядзібах і турыстычных комплексах[20], музеях[21], санаторыях[22], прадпрыемствах грамадскага харчавання[23] і г.д.

Важны ўнёсак у працэс захавання і рэпрэзентацыі традыцыйнай каляндарнай абраднасці Беларускага Падзвіння робяць мясцовыя жыхары, краязнаўцы, настаўнікі. Так, пры актыўным удзеле В. Шкіндзера і В. Тухта на Лепельшчыне адзначаюцца такія святы, як Жаніцьба Цярэшкі[24], Жніво[25].

Пэўныя атрыбуты каляндарнай абраднасці, растыражаваныя персанажы, нават самі назвы святаў таксама могуць выкарыстоўвацца ў пазафальклорнай сферы. Пры аналізе сітуацыі на беларускім рынку брэндаў можна зрабіць выснову, што каляндарныя святы, якія былі распаўсюджаны ў тым ліку на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, фігуруюць у назвах той ці іншай прадукцыі, асобнай калекцыі ці нават фірмы. Напрыклад, ювелірная крама “EGO-ART”, філіялы якой есць у Полацку, Віцебску, Наваполацку, стварыла калекцыю пад назвай “Kupalle”. Сярод прадукцыі ёсць кулон з выявай Ярылы, папараць-кветкі, завушніцы з выявай сонца[26]. Дзяржаўнае прадпрыемства “Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу” ў 2014 г. выпусціў інфармацыйна-даведкавы каталог “Ваша свадьба”, у якім разам з рэкламай вясельных паслуг, арэнды лімузінаў і рэстаранаў, рэкламавалі калядна-абрадавую гульню “Жаніцьба Цярэшкі”[27], якая з’яўляецца адметным элементам каляндарнай традыцыі Беларускага Падзвіння. Тэматыку традыцыйных каляндарных святаў таксама выкарыстоўваюць рамеснікі для прасоўвання сваёй прадукцыі: паштовак, карцін, посуду і г.д. Акрамя таго, дзяржаўнае прадпрыемства “Белкартаграфія” выпусціла турыстычную карту “Кулінарная спадчына Беларусі”[28], у якой прадстаўлена велікодная страва “Масляны баран”, што ў 2013 г. была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь[29].

Зразумела, уводзячы на рынак брэнды, якія выкарыстоўваюць традыцыйныя этнакультурныя сімвалы, бізнес дзейнічае пераважна ў сваіх інтарэсах, павялічваючы канкурэнтныя перавагі тавару, падвышаючы камерцыйныя выгоды, пашыраючы пазнавальнасць брэнда. Пры гэтым ён у любым разе будзе выкарыстоўваць найбольш папулярную і запатрабаваную ў аўдыторыі, найбольш даступную для яе мастацкую мову, каб данесці сімвалічны змест [10, с. 134].

Такім чынам, адным з важных крытэрыяў у працэсе рэпрэзентацыі і выкарыстання пэўнай з’явы традыцыйнай культуры ў якасці этнакультурнага брэнду з’яўляецца яе “тэрытарыяльнасць”. Вядома, што элементы нематэрыяльнай культуры могуць быць агульнанацыянальнымі па сваім значэнні, але па паходжанні і геаграфіі бытавання яны амаль заўсёды вузкалакальныя, г. зн. належаць канкрэтнай супольнасці і існуюць у мясцовай культуры, таму для стварэння лакальнага сімвала прывязка культурнай з’явы да пэўнай тэрыторыі дадае дадатковую каштоўнасць. Яшчэ адным немалаважным крытэрыем, каб тая ці іншая культурная з’ява аказалася вызначальнай для брэндавання пэўнай тэрыторыі, з’яўляецца яе “атракцыйнасць”. Гэта азначае, што абранае традыцыйнае свята павінна выклікаць станоўчыя ўражанні, вылучацца сваім эмацыйным зместам і мастацкімі якасцямі. Апроч “тэрытарыяльнасці” і “атракцыйнасці”, існуюць катэгорыі “гістарычнасці” і “аўтэнтычнасці”. Усе гэтыя крытэрыі актыўна праяўляюцца ў далейшым працэсе раскручвання адметнасці тэрыторыі праз медыя. З аднаго боку, удзельнікі працэсу (журналісты, якія асвячаюць мерапрыемствы, супрацоўнікі культуры,

[19] Тэатральная музычаня пастаноўка “Калядная містэрыя”. URL: https://www.psu.by/be/naviny/padzei/teatralizavanaya-muzychnaya-pastanouka-kalyadnaya-misteryya (дата звароту: 29.12.2025).

[20] Абрад “Жаніцьба Цярэшкі” разам з кампаніяй “Лімберы”. – URL: https://limberi.by/novosti/abrad-zhanicba-cyareshkiz-udzelnictvam-kampanii-limbery.html (дата звароту:12.11.2025).

[21] “Жаніцьба Цярэшкі” на Рождество. – URL: https://lepelby.net/news2/416 (дата звароту:10.11.2025).

[22] В санатории прошло веселое празднование праздника Ивана Купала! – URL: https://www.sanatorium-borovoe.by/v-sanatorii-proshlo-veseloe-prazdnovanie-prazdnika-ivana-kupala (дата звароту:12.11.2025).

[23] Жаніцьба Цярэшкі. – URL: https://gorodvitebsk.by/afisha/action/7201 (дата звароту: 14.01.2026).

[24] Велеўшчына – скарбонка традыцый. Тухта Валер. – URL: https://blukach.by/post/1379 (дата звароту: 09.01.2026).

[25] Фэст “Жнівень”. – URL: https://vk.com/wall-39408858_1095 (дата звароту: 12.12.2025).

[26] EGO-ART. – URL: https://ego-art.by/collections/Kupalle-serebro/ (дата звароту:12.12.2025).

[27] “Ваша свадьба”. – URL: https://marketvit.by/wp-content/uploads/2017/08/Vasha-Svadba-2016.pdf (дата звароту: 08.01.2026).

[28] “Кулинарное наследие Беларуси” турыстычная карта. – URL: https://shop.belkarta.by/catalog/putevoditeli_turisticheskie_karty_atlasy/turisticheskie_karty_rb/kulinarnoe_nasledie_belarsi_turistskaya_karta/. (дата звароту: 13.01.2026).

[29] Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – URL: http://gosspisok.gov.by/(X(1)S(r34hj5c1paotswthj5vr1fag))/?size=500&page=11&AspxAutoDetectCookieSupport=1. (дата звароту: 20.12.2025).

прадстаўнікі фальклорных калектываў), з другога боку, звычайныя назіральнікі (блогеры, госці) пры стварэнні рэпартажаў, пастоў, калонак у газетах, апелюючы такімі словамі, як *самабытнасць*, *старажытнасць*, *спрадвечнасць*, *сапраўднасць* і г.д. павялічваюць сімвалічную значнасць этнарэгіянальнага вобраза і яго адметнасць. Аднак, пры пошуку і стварэнні сімвала і брэнда тэрыторыі трэба ўлічваць, што часта значэнне мае не "аб'ектыўная" архаіка вобраза ці практыкі як такія, але ацэнка іх сучаснікамі, бо не кожная традыцыя валодае каштоўнасцю для суб'екта, а толькі тая, што нясе істотныя сэнсы менавіта сёння [3, с. 86].

**Заключэнне.** Традыцыйная каляндарная абраднасць беларусаў Падзвіння ў канцы ХХ – першай чвэрці ХХІ ст. актыўна рэпрэзентуецца і папулярызуецца ва ўстановах культуры і адукацыі, фальклорнымі калектывамі, выкарыстоўваецца ў сферы турызму (у прыватнасці, з мэтай брэндавання турыстычных дэстынацый і лакацый), а таксама для прасоўвання розных відаў тавараў (адзення, упрыгожанняў, напояў і г.д.) і паслуг. У інструменталізацыі элементаў беларускай традыцыйнай культуры для брэндынгу тэрыторыі ўмоўна можна вылучыць два асноўныя напрамкі: з аднаго боку, гэта імкненне стварыць "твар" пэўнай тэрыторыі "зверху", гэта значыць актарамі, якія ўдзельнічаюць у ажыццяўленні культурнай палітыкі; з другога – гэта стварэнне іміджу тэрыторыі "знізу" (пры дапамозе мясцовых жыхароў, сельскіх прадпрымальнікаў, фальклорных калектываў і г.д.).

У наш час на тэрыторыі Беларускага Падзвіння найбольш актыўна рэпрэзентуюцца і папулярызуюцца элементы каляднай абраднасці (найперш, абыход калядоўшчыкаў, калядна-абрадавая гульня "Жаніцьба Цярэшкі"), Масленіца, Вялікдзень (у тым ліку валачобны абрад), Купалле, Жніво. Па-першае, гэта абумоўлена гістарычнай распаўсюджанасцю свят у рэгіёне і наяўнасцю іх разгорнутага апісання ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Па-другое, на сучасным этапе важным з'яўляецца суб'ектыўны фактар, калі чалавек (ансамбль, фальклорны калектыў і інш.), абапіраючыся на свае густы, адукацыю і бачанне, абірае свята для рэканструявання. Патрэцяе, яны адпавядаюць асноўным крытэрыям (атракцыйнасць, вядомасць, тэрытарыяльнасць, аўтэнтычнасць), па якіх тая ці іншая культурная з'ява аказваецца вызначальнай для прэзентацыі пэўнай тэрыторыі.

Прагматычныя функцыі, якія выконваюць беларускія традыцыйныя каляндарныя святы на сучасным этапе, можна ўмоўна падзяліць на знешнія і ўнутраныя. Да знешніх функцый адносіцца развіццё турызму, пашырэнне прадпрымальніцтва, палітычныя функцыі (ідэалагічнае і патрыятычнае выхаванне і інш.). У сваю чаргу пад унутранымі трэба разумець забеспячэнне культурных патрэб насельніцтва, яго інфармаванне і адукацыю, спрыянне кансалідацыі той ці іншай мясцовай супольнасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык У.Я. Асаблівасці каляндарных памінальных абрадаў беларусаў Лепельшчыны // Лепельскія чытанні: матэрыялы VI навук.-практ. канф. (Лепель, 17 – 18 кастрычніка 2014 г.) / Установа культуры "Лепельскі раённы краязнаўчы музей". – Мінск: Медысонт, 2014. – С. 50–58.
2. Святы / В.М. Бялявіна, А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак, Л.В. Ракава // Беларусы: У 6 т. – Т. 6: Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко і інш.; рэдкал.: В.М. Балявіна і інш.; Ін-т маст-ва, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.. Мінск: Бел. навука, 2002. – 606 с. – С. 299–599.
3. Валодзіна Т.В. Канструяванне традыцыі. У пошуках цмока // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр. – Мінск: Бел. навука, 2021. – Вып. 8. – С. 61–93.
4. Валодзіна Т.В., Кухаронак Т.І. Сучасныя формы і тэндэнцыі захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. – Мінск: Бел. навука, 2017. – Т. 4: Культура ХХ – пачатку ХХІ ст. / А.І. Лакотка, А.С. Шамрук, Т.В. Габрусь і інш. – С. 620–664.
5. Динни К. Брендинг территории. Лучшие мировые практики / Под ред. К. Динни; пер. с англ. В. Сечной. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2013. – 336 с.
6. Королев К.М. Кот Баюн и квазифольклорная составляющая современной массовой культуры // Антропологический форум – 2018. – № 39. – С. 52–87. DOI: https://doi.org/10.31250/1815-8870-2018-14-39-52-87.
7. Овсейчик В.Е. К вопросу об этнокультурном районировании Белорусского Подвинья // Псковский регионологический журнал. – 2019. – Вып. 2(38) – С. 36–50.
8. Ляшкевіч А.І. Масленічная калодка, сінанімічныя прадметы і пакаранне моладзі за неўступленне ў шлюб // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук пр. – Мінск: Бел. навука, 2020. – Вып. 7. – С. 318–350.
9. Савина Н.А. Куда скачет тыгыдымский конь (о языковой игре, фольклорном персонаже, туристическом брендинге и новом сельском культурном предпринимательстве) // Антропологический форум. – 2022. – № 53. – С. 40–72. DOI: https://doi.org/10.31250/1815-8870-2022-18-53-40-72.
10. Соколова М.Е. От архетипа к бренду: теория и практика // Коммуникации. Медиа. Дизайн. – 2023. – Т. 8, № 3. – С. 126–142.
11. Dinnie K. Nation branding: Concepts, Issues, Practice. – 3 ed. – London: Routledge, 2022. – 302 p. DOI: https://doi.org/10.4324/9781003100249.
12. The Invention of Tradition / E. Hobsbawm, H. Trevor-Roper, D. Cannadine, B. S. Cohn et al.; ed. by E. Hobsbawm and T. Ranger. – Cambridge: Cambridge University Press, 1983. – 324 p.
13. Sirovátka O. Wege zur Erforschung des Folklorismus. Der Folklorismus als Thema der Volkskunde // Narodna umjetnost – 1993. – Vol. 30 – P. 249–256.


*Паступіў 02.02.2026*

# КАЛЕНДАРНЫЕ ПРАЗДНИКИ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ: СОВРЕМЕННЫЕ ИНТЕРПРЕТАЦИИ И ФОРМЫ ВЫЯВЛЕНИЯ

***А.С. ЦЫГАНКОВА***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы***
***Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье анализируются современные репрезентации элементов белорусской традиционной культуры на территории Белорусского Подвинья. Раскрываются прагматические функции, которые выполняют традиционные календарные праздники белорусов на современном этапе развития общества. Рассматриваются формы и практики популяризации календарной обрядности белорусов Подвинья: от фольклорных лекций и мастер-классов до масштабных этнофестивалей на агроусадьбах.*

***Ключевые слова:*** *белорусская традиционная культура, календарные праздники, репрезентация, инструментализация, этнорегиональный бренд, Белорусское Подвинье.*

# CALENDAR HOLIDAYS OF THE BELARUSIAN PODVINYE: MODERN INTERPRETATIONS AND FORMS OF IDENTIFICATION

***A. TSYGANKOVA***
***(The Center for the Belarusian culture, language and literature researches of***
***National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*This article analyzes contemporary representations of elements of Belarusian traditional culture in the Belarusian Dvina region. It explores the pragmatic functions of traditional Belarusian calendar holidays in the current stage of social development. It examines the forms and practices of promoting the calendar rituals of Belarusians in the Dvina region, from folklore lectures and master classes to large-scale ethnic festivals held at agro-tourism estates.*

***Keywords:*** *belarusian traditional culture, calendar holidays, representation, instrumentalization, ethnoregional brand, Belarusian Dvina.*